# Дом, дзе паселяцца Веды

**Дом, дзе паселяцца веды, спадчына, гісторыя і сучаснаць, пачынае набываць рэальныя абрысы. Яшчэ ледзь угадваецца контур бліскучага будынка складанай геаметрычнай формы, які мы ўсе неаднойчы бачылі ў макеце па тэлевізары, але падмурак закладзены, сцены растуць, гудуць, краны, шчыруюць будаўнікі — значыць, Нацыянальная бібліятэка можа смела рыхтавацца да наваселля. У тым, што яно абавязкова будзе, сумненняў нямя ніякіх.**

**Будынак, які расце ў сталічным мікрараёне Усхад, на месцы невялікай вёскі Сляпня (такі ўжо лёс ў блізкіх да вялікіх гарадоў вёсак — рана ці позна знікнуць у чэраве мегаполіса. І Сляпні тут у нечым можна нават пазайдросціць) — унікальны. Не толькі па сваёй незвычайнай архітэктуры, якая нагадвае апрацаваны каштоўны камень ці фантастычны аб'ект горада будучыні. Гэта не надта вялікае дзіва — на дварэ ўсё ж трэцяе тысячагоддзе. Адметнасць яго ў іншым — у нашай найноўшай гістоыі грошы ўсёй грамадой збіралі толькі на будаўніцтва святых храмаў. Цяпер жа мы разам з дзяржавай будуем Храм Ведаў. Усявышні за тое на нас пакрыўдзіцца не павінен — мы робім гэта дзеля сваіх нашчадкаў.**

**Дом, дзе паселяцца кнігі, пакрысе расце. Вялікая нагода для гонару ці не кожнага з нас. Цяпер можна прывесці сваё дзіця на гэту будоўлю і сказаць: "Вунь тая цаглінка — мая". Паверце вашы дзеці абавязкова гэта запомняць, каб сказаць пра тое вашым унукам.**

**А пакуль наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук прапануе паглядзець на будоўлю адтуль, адгуль відаць, як яна віруе, — з падмурка цоколя, які будзе трымаць усю канструкцыю.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА



